**Лічбы.** Сукупная бібліятэчная сетка Беларусі налічвае каля 7 тысяч публічных і спецыяльных бібліятэк з агульным аб'ёмам фонду амаль 180 млн экзэмпляраў. Аб гэтым на міжнародным круглым стале «Бібліятэкі і бібліятэчныя грамадскія аб'яднанні ў кантэксце сучаснасці» ў анлайн-фармаце паведаміў намеснік генеральнага дырэктара — дырэктар па інфармацыйных рэсурсах і абслугоўванні карыстальнікаў Нацыянальнай бібліятэкі. «Каля 34 % бібліятэк (2348) знаходзяцца ў ведамстве Міністэрства культуры, пры гэтым 78 працэнтаў публічных бібліятэк размешчаны ў сельскай мясцовасці. Адным са спосабаў аптымізацыі бібліятэчнай сеткі з'яўляецца аб'яднанне сельскіх публічных і школьных бібліятэк. Агульнарэспубліканскі эксперымент па стварэнні аб'яднаных бібліятэк быў пачаты яшчэ ў 2011 годзе, і сёння ў рэспубліцы функцыянуе 475 такіх устаноў», — сказаў Віктар Пшыбытка.